Звязда

27.03.2018

# У Мінску адкрыецца выстава «Беларускі буквар: 400 гадоў гісторыі»

Дар'я Спевак

**29 сакавіка а 16 гадзіне ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбудзецца адкрыццё выставы «Беларускі буквар: 400 гадоў гісторыі» да юбілею першага ў свеце выдання пад назвай «Буквар».**




На выставе пакажуць знакамітыя буквары і азбукі XVI–XXI стагоддзяў – розныя па складзе, графіцы, мастацкім аздабленні, педагагічных прыёмах навучання чытанню і пісьму.

Сярод экспанатаў прадставяць адны з самых старажытных айчынных кніг для навучання. Сярод іх і знакамітыя буквары з праваслаўных манастыроў, і малавядомыя выданні для ўніятаў і старавераў.

*– Асаблівую цікавасць прадстаўляюць беларускія падручнікі для навучання чытанню пачатку XX стагоддзя: беларускія лемантары і чытанкі Каруся Каганца, Цёткі, Якуба Коласа, Вацлава Ластоўскага, Янкі Станкевіча, Леанілы Гарэцкай і інш. Шмат нечаканага кожны наведвальнік можа знайсці ў беларускіх савецкіх букварах перыяду ліквідацыі непісьменнасці, у заходнебеларускіх букварах, выданнях беларускай дыяспары за мяжой,* – расказваюць арганізатары.

Адным з найлепшых беларускіх буквароў XX – пачатку XXI ст. лічыцца знакаміты «Буквар» Анатоля Клышкі, які ўпершыню выдадзены ў 1969 годзе і перавыдаваўся 23 разы на беларускай, рускай і польскай мовах. На выставе можна будзе ўбачыць і найноўшыя буквары, падрыхтаваныя Вольгай Цірынавай.

*– Але найбольш цікавай задачай для гасцей Музея кнігі стане спроба знайсці той самы «Буквар», з якога яны пачыналі сваю школьную навуку. Выстава дапоўнена старымі дзённікамі і сшыткамі, невядомымі сучасным школьнікам прыладамі для пісьма і іншымі артэфактамі школьнага жыцця,* – распавялі ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.